Неабходным з’яўляецца ўменне не толькі авалодаць інфармацыяй, але і крытыч-на яе ацаніць , асэнсаваць, прымяніць.

*Красноўская В.А.*

# Ключ да слоўнікавай дыктоўкі

Няўмека, няпраўда, не прыяцель, а вораг, неласкавы прыём, негаваркая дзяўчына, нясцерпны боль, не гарачы, а халодны суп, непахісны воін, далёка не багатая гаспадарка, ніколечкі не цікавая кніга, не чытаў, недамагаць, няволіць, недасаліць.

# Кластэры (гронкі)



# Кластэр па тэме “Правапіс *не (ня)* з рознымі часцінамі мовы”



# Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі

*Мэты:*

- *паўтарыць, сістэматызаваць і свабодна аперыраваць ведамі па тэме "Правапіс не (ня) з назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі ";*
- *усвядоміць адметнасць правапісу не (ня) з дзеепрыметнікамі;*
- *удасканальваць уменне заўважаць, мае ці не мае дзеепрыметнік залежныя словы, у поўнай ці кароткай форме ўжываецца ў сказе;*
- *выпрацоўваць навыкі граматнага пісьма;*
- *развіваць ўменне крытычна аналізаваць інфармацыю, здольнасць яе сістэматызаваць, ацэньваць і прымяняць на практыцы;*
- *выхоўваць адказнасць за вынікі працы.*

# ПРЫЁМ “Інсэрт”

| « V » | « + » | « ? » |
|---|---|---|
| ***Пастаўце “V” на палях, калі тое, што вы чытаеце, адпавядае таму, што вы ведаеце*** | ***Пастаўце “+” на палях, калі тое, што вы чытаеце, з’яляецца для вас новым*** | ***Пастаўце “?” на палях, калі тое, што вы чытаеце, не можаце зразумець*** |

# Прыём «Ацэначнае акно»



# Пазнавальнае заданне

## “Правільныя і няправільныя сцвярджэнні”

1. Сцвярджаю, што часціца ***не*** пішацца асобна з кароткімі дзеепрыметнікамі: *дзверы не зачынены, падлога не памыта, пачастункі не куплены.*

2. Кароткую форму маюць толькі дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу. Яны змяняюцца па родах і ліках, але не скланяюцца: *насенне сабрана, сачыненне напісана, лугі скошаны.*

3. Для таго, каб не памыліц-
ца ў напісанні ***(не, ня)*** з
поўнымі дзеепрыметнікамі,
абавязкова трэба вызначыць
іх стан і час.

4. Часціца ***не*** пішацца разам з поўнымі дзеепрыметніка-мі, пры якіх ёсць залежнае слова: *яшчэ непрыбраны луг, нікім незаўважаны ча-лавек, непадпісаныя дырэк-тарам загады.*

5. ***Не*** з дзеепрыметнікамі пішацца асобна, калі ў сказе ёсць ***супрацьпастаўленне*** са злучнікам ***а***, якое адносіцца да дзеепрыметніка: *не скончанае, а толькі пачатае выступленне.*

6. Напісанне ***не (ня)*** з дзееприметнікамі правільнае ва ўсіх наступных сінтаксічных канструкцыях: *неадпрасаваная бялізна, біяграфія ненапісана, не надрукаваны рэдактарам рэпартаж.*

# Правільны запіс

# 11010

# **Алгарытм прымянення правіла**

# "Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі"

1. **Вызначы дзеепрыметнік і дакажы, што ён ужываецца без *не*.**
2. **Устанаві, у *поўнай* ці *кароткай форме* ўжываецца дзеепрыметнік:**

**у кароткай форме** → пішы асобна

**у поўнай форме** → глядзі наступны пункт

3. **Ці мае дзеепрыметнік *супрацьпастаўленне са злучнікам а* або *залежныя словы*:**

**так** → пішы асобна

**не** → пішы разам

4. **На які склад падае націск?**

**на 2-і** → пішы ня-

**на іншы** → пішы не-

# Прачытайце сказы. Знайдзіце дзеепрыметнікі і растлумачце іх правапіс

1. *Нікім не палітыя кветкі ўжо пачыналі вянуць.*
2. *Не разбуджаная мамаю дзяўчынка так і праспала да дзесяці гадзін.*
3. *На полі віднеліся не абрэзаныя, а толькі сабраныя ў кучы буракі.*
4. *У слоіку знайшлося трошкі нямолатай кавы.*

5. На не засланым абрусам стале стаяла пустая бутэлька малака і ляжаў  непачаты бохан хлеба.

6. Нельга сеяць ў не абагрэтую сонцам зямлю.

7. З незабітага ліса футра не пашыеш.

8. Столь  не пабелена.

9. Аповесць не закончана.

## Заданне 2.

**Прачытайце сказы. Падбярыце да выдзеленых дзеепрыметнікаў залежныя словы. Растлумачце правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі**

*1. Думка пра* ***нявыкананае*** *заданне мучыла дзяўчынку. 2. У* ***непрыбраным*** *пакоі было няўтульна і холадна. 3. На стале ляжаў* ***непачаты*** *пачак пячэння. 4.* ***Незабытая*** *крыўда не давала спакою.*

## *Заданне 3.* **Спішыце сказы, апускаючы дужкі. Растлумачце напісанне *не (ня)* з дзеепрыметнікамі.**

1. Бандэроль (не, ня) адпраўлена. 2. На яшчэ (не, ня) скошаным лузе трашчалі конікі. 3. (Не, ня) загорнуты часопіс ляжаў на канапе. 4. На паліцы знаходзіўся (не, ня) дапісаны, а толькі пачаты аўтарам рукапіс. 5. (Не, ня) падмеценыя алеі былі ўсыпаны лісцем. 6. Было крыху страшнавата на (не, ня) асветленай ліхтарамі вуліцы.7. Дамы стаяць (не, ня) прыціснутыя адзін да аднаго, а на адлегласці. 8. Дровы (не, ня) прывезены.

# Правільны варыянт напісання
# *не (ня)* з дзеепрыметнікамі

1. Бандэроль не адпраўлена.
2. На яшчэ не скошаным лузе трашчалі конікі.
3. Незагорнуты часопіс ляжаў на канапе.
4. На паліцы знаходзіўся не дапісаны, а толькі пачаты аўтарам рукапіс.
5. Непадмеценыя алеі былі ўсыпаны лісцем.
6. Было крыху страшнавата на не асветленай ліхтарамі вуліцы.
7. Дамы□ стаяць не прыціснутыя адзін да аднаго, а на адлегласці.
8. Дровы не прывезены.

# Заданне “Карэктар”

**Знайдзіце і выпраўце памылкі ў напісанні *не (ня)* з дзеепрыметнікамі**

Нязабыўнае свята,
героі незабыты,
не дарobленая справа,
незагарэлы твар,
нікім непатрывожаная цішыня,
таямніца не разгадана.

# Ключ да задання “Карэктар”

Незабыўнае свята,
героі не_забыты,
недаробленая справа,
незагарэлы твар,
нікім не_патрывожаная цішыня,
таямніца не разгадана.

# Праверачнае заданне “Рэшата”

***Размяркуйце прыклады па графах табліцы (упішыце толькі нумары)***

| Разам | Асобна |
| --- | --- |
| | |

# Правільныя адказы

## Варыянт 1

| Разам | Асобна |
| --- | --- |
| 1, 3, 6, 9, 10 | 2, 4, 5, 7, 8 |

## Варыянт 2

| Разам | Асобна |
| --- | --- |
| 1, 4, 5, 8, 10 | 2, 3, 6, 7, 9 |

# Рамонак Блума



# Дамашняе заданне
## (на выбар)

- § 38,

1) практыкаванне **349** (спісаць сказы, апускаючы дужкі);
2) скласці **слоўнікавы дыктант** на правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі;
3) практыкаванне **352** (перакласці тэкст з рускай мовы на беларускую).